MOKSLŲ AKADEM… BIBLIOTEKA

Nr. 42 „B. Krynicy“ z dn. 24.XII.1931 h, jaki mieŭ 6 bačyn druku, SKANFISKAWANY.

Cana asobnaha numaru 20 hr.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 43 Wilnia, Sierada 30 Śniežnia 1931 h. Hod VII (XV).

Biełaruskaja KRYNICA

PALITYČNAJA, HRAMADZKAJA i LITERATURNAJA HAZETA

Adres Redakcyi i Administracyi:
WILNIA, LUDWISARSKAJA 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4 hadz. wieč.

Ceny abwiestak pawodle ŭmowy.

„Bieł. KRYNICA“ kaštuje na hod—4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy—1 zał. Zahranicu ŭdwaja daražej.
HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Usim našym supracoŭnikam, čytačom i prychilnikam, z pryčyny Kaladnych światkoŭ i Nowaha 1932-ha hodu, światočnyja pažadańni składaje

Red. i Adm. „BIEŁ. KRYNICY“.

Paśla Žjezdu Biełaruskaj Chryścijanskaj Demokracyi i kanfiskaty Nr. 42 „Bieł. Krynicy“.

Dnia 13 śniežnia 1931 h., jak my ŭžo padawali, adbyŭsia ŭ Wilni Žjezd delehataŭ—pradstaŭnikoŭ Biełaruskaj Chryścijanskaj Demokracyi.

Na hety Žjezd byli žjechaŭšysia pradstaŭniki B.Ch.D. z usich kutkoŭ našaj krainy, jak kataliki, tak i prawasłaŭnyja z wajawodztwaŭ: Wilenskaha, Nawahradzkaha i Biełastockaha, pradstaŭlajučy pawiety: Ašmianski, Baranawicki, Brasłaŭski, Dziśnienski, Staŭpiecki, Wałožynski, Waŭkawyski, Postaŭski, Sakolski, Wialejski, Lidzki, Wil.-Trocki i inš., a tak-ža prybyli na narady Žjezdu i pradstaŭniki B.Ch.D. ad biełaruskaha miestawaha rabotnictwa.

Na Žjeździe było prysutnych 101 pradstaŭnik i 24-och haściej.

Narady Žjezdu adbylisia ŭ nastupnym paradku: 1, **Adkryćcie naradaŭ Žjezdu**, 2. **Referat**, 3. **Sprawazdača Centralnaha K-tu B.Ch.D. za minuły čas**, 4. **Wybary kamisii dziela apracoŭki rezalucyjaŭ i karektury prahramy i Statutu B.Ch.D. i supolnaja fatahrafija Žjezdu.** 5. **Dakłady z miajscoŭ** 6. **Pierawybary Centralnaha K-tu B.Ch.D. i Rewizyjnaj Kamisii** i 7. **Rezalucyi.**

Rezalucyi Žjezdu i skład nowawybranych uładaŭ B.Ch.D. my ŭžo apublikawali ŭ prošłym 41 numary „Bieł. Krynicy.“

U dakładach z miajscoŭ pramaŭlali: hram. J. Krasoŭski (Postaŭski pawiet), M. Dwarecki (Brasłaŭski paw.), A. Waškowič (Miedniki Wil.-Trocki paw.), J. Jarmałkowič (Wil.-Trocki paw.), B. Babaryka (Wialejski paw.), W. Čaplinski (Ašmianski paw.), J. Čarnecki (Baranawicki paw.), A. Sienkiewič (Dziśnienski paw.) i J. Fiedarowič (Turhieli Wil.-Trocki paw.).

Žjezd pradstaŭnikoŭ B.Ch.D. 13.XII.31 h. ŭ Wilni.

Žjezd B.Ch.D. skorehawaŭ dwa parahrafy prahramy i pašyru arhanizacyjny statut B.Ch.D.

Usie pastanowy Žjezdu — skoryhawanuju prahramu i arhanizacyjny statut B.Ch.D., a tak-ža referat, budziem drukawać u nastupnych numaroch našaj hazety.

Kab paznajomić našych čytačoŭ z pracaj Žjuzdu, my padawali apisaśnie najbolš ważnych mamentaŭ u numary 42 „Bieł. Krynicy“ (24.XII 1931), ale hety numar „B. Krynicy“ administracyjnyja ŭłady za staćci: „Narady Žjezdu pradstaŭnikoŭ Biełaruskaj Chryścijanskaj Demokracyi,“ „Pieramoha“ (z studenskaha žyćcia) i karespandencyju z Nowajelni pad zahałoŭkam „Ab našym žyćci“, skanfiskawali.

U hetym 43 numary źmiaščajem uwieś materjał z Nr 42, apražča staćciej skanfiskawanych.

Z hazet.

Prezydent Masaryk ab narodnych mienšaściach i mirnych dahaworach.

U swoj čas adna niamieckaja hazeta apublikawała hutarku swajho karespandenta z prezydentam Čechasławackaj respubliki T. G. Masarykam. U hetaj hutarcy prez. Masaryk zajawiŭ, što pawinny być častkowa źmienieny mirnyja dahawory, a pradusim musić być raźwiazana sprawiadliwa pytańnie narodnych mienšaściaŭ.

Takoje stanowišča prez. Masaryka ŭ hetaj sprawie wyklikała niezdawaleńnie ŭ polskich dziaržaŭna-palityčnych kruhoch. Kab prakanacca biespasredna ab pohladach prez. Masaryka na hetuju sprawu, supracoŭnik polskaj „Gazety Warszawskiej“ sumyśla adwiedaŭ prez. Masaryka i mieŭ z im hutarku. Prez. Masaryk pradstaŭniku polskaj hazety ab sprawie narodnych mienšaściaŭ zajawiŭ, što henaje pytańnie musić być raźwiazana sprawiadliwa i nikoli šlacham hwałtaŭ. Pry hetym prez. Masaryk padkreśliŭ, što narodnyja mienšaści musiać mieć poŭnuju swabodu raźwićcia.

Ab tym, jak raźwiazana pytańnie nacyjanalnych mienšaściaŭ u Čechasławaččynie świedčyć fakt, što ŭ skład čechasławackaha ŭradu ŭwachodziać dwa ministry niamieckaj nacyjanalnaści.

U sprawie rewizii mirnych dahaworaŭ, prez. Masaryk wykazaŭ swoj pohlad hetak: — rewizija mirnych dahaworaŭ nia moža być prawiedziena adnaboka, ale ŭ zhodzie z tymi, chto hetyja dahawory padpisali. *r.*

Papraŭka.

U prošłym 41 numary „B. Krynicy“ u VI častcy rezalucyjaŭ Žjezdu B.Ch.D , dzie haworycca ab pratešcie prociŭ aružnaj interwencyi fašyzmu, z pčyčyn niedahladu nadrukawana „fašyzmu i kamunizmu“, a treba „fašyzmu i kapitalizmu“, dalej u tym ža skazie nadrukawana „padziejaŭ“, a treba—„padziełaŭ“, tak, što hety skaz u prawilnaj redakcyi budzie wyhladać tak: „Razam z hetym Žjezd pratestuje prociŭ usiakich sprob z boku mižnarodnaha fašyzmu i kapitalizmu da aružnaj interwencyi, uważajučy jaje za pačatak nowych padziełaŭ, nowaj niawoli i nowych niaščaściaŭ dla Biełaruskaha narodu“ —

Usio inšaje nadrukawana prawilna.

Z Biełaruskaha žyćcia

Ks. Ad. Stankiewič operawany. Dawiedywajemsia, što wiedamy biełaruski dziejač Ks. Adam Stankiewič, jaki doŭhi ŭžo čas niedamahaŭ na zdaroŭi, byŭ zmušany ŭreščie anahdaj paddacca operacyi ślapoj kiški (appendycyt). Operacyja była prawiedziena ŭ paniadziełak 21 h. m. ŭ Wilenskaj Litoŭskaj Klinicy i ŭdałasia pamysna. — Wyrazim dumku biazumoŭna ŭsich našych čytačoŭ i sympatykaŭ, kali pažadajem Pawažanamu Pacyjentu jaknajchutčejšaha wyzdaraŭleńnia i pawarotu ŭznoŭ da płodnaj pracy na biełaruskaj niwie.

Nabaženstwa dla biełarusaŭ-katalikoŭ u kaściele św. Mikałaja, z pryčyny kaladnych świat u wilenskich biełaruskich školach, nia budzie da 10 studzienia 1932 h. ŭklučna i pačniecca pa Kaladach u niadzielu 17 studzienia 1932 h.

Z BIEŁARUSI PAD SAWIETAMI.

Biełaruskaja dziaržaŭnaja biblijateka. U kastryčniku s. h. adčyniłasia ŭ Miensku Bieł. Dziaržaŭnaja biblijateka, jakuju pačali budawać u 1929 h. Biblijateka maje try pawierchi i raźli-

čana na 600 tysiač knih. Najlepš pastaŭlenym źjaŭlajecca addzieł techniki, kudy prychodzić pamiž inšym šmat zahraničnyah wydańniaŭ. Biełaruski addzieł naličwaje 34.000 tomaŭ, pamiž jakimi možna znajści ŭsie knižki i časopisi, jakija wychodziać u biełaruskaj mowie. Jość tak-ža niewialiki addzieł z Zach. Biełarusi. Ad 1. I. 32 h. biblijateka budzie atrymliwać u abawiazkawym paradku pa 2 ekz. ŭsich knih, jakija wydajucca ŭ Sawieckim Sajuzie.

Nowy wyšejšy ŭradawiec. Na namieśnika Nar. Kam. Aświety ŭ Saw. Biełarusi naznačany siabra B.Akademii Nawuk Wolfson. Hety samy Wolfson naznačany tak-ža staršynioju Dziaržaŭnaha wučonaha Sawietu B.S.S.R. Wolfson rodam z Babrujskich žydoŭ. Na praciahu apošnich 9 hadoŭ Wolfson byŭ staršynioju ŭsiebiełaruskaj sekcyi nawukowych pracaŭnikoŭ i prafesaram Mienskaha uniwersytetu.

Nowaja časopiś. Centraarchiŭ Biełarusi pačynaje z 1 studzienia 1932 h. wydawać časopiś „Archiŭ Sawieckaj Biełarusi", u jakim buduć drukawacca hałoŭnym čynam tyja materjały, jakija da hetaha času nia byli apublikawany. U hod budzie wychodzić 4 numary. Pieršy numar budzie pryświačany 1917 hodu, a asabliwa akupacyi Doŭbar-Muśnickaha.

Trochi z sawieckaj statystyki. „Зьвязда" (5.XI.) padaje statystyčnyja danyja z žyćcia Saw. Biełarusi. Karystajem i my z hetaj statystyki; adkaznaść za praŭdziwaść jaje składajem całkom na plečy redaktaroŭ „Зьвязды".

I tak: z 1-ha studzienia 1931 hodu wychodzić pa B.S.S.R. 13 centralnych i 56 rajonnych drukawanych hazet, jakija wydajucca pabiełarusku z staronkami nac. mienšaściaŭ (rasiejskaj, žydoŭskaj, polskaj). Aproč hazet wydawałasia tak-ža 20 žurnałaŭ.

Isnuje 5 literaturnych abjadnańniaŭ: 1. Bieł. APP (Maładniak), 2) Połymia, 3) Uzwyšša, 4) Bieł. Literaturnaje Abjadnańnie Čyrwonaj armii i flotu, 5) Abjadnańnie Praletarska-kałhasnych piśmieńnikaŭ. Usie hetyja abjadnańni hurtujuć kala 200 piśmieńnikaŭ. (Što datyča dwuch apošnich abjadnańniaŭ, to nawat sawieckaja presa—„Зьвязда" 15. XI. s. h.—pryznaje, što jany isnujuć tolki na papiery. Zatoje pieršyja try pracujuć wielmi šyroka) Biełaruskaja literatura zajmaje ciapier widnaje miejsca nia tolki ŭ ahulnaj kulturnaj pradukcyi B.S.S.R., ale i ŭ kulturnym žyćci ŭsiaho S.S.S.R.

U 1931 h. jość u Saw. Biełarusi 2 biełaruskija dziaržaŭnyja teatry (Miensk i Wiciebsk), dziaržaŭny žydoŭski i polski teatry, dziaržaŭny wandroŭny biełaruski teatr i h. d.

U dziaržaŭnym aparacie B.S.S.R. lik biełarusaŭ byccam składaječ 61 prac., zwyš 50 prac. biełarusaŭ znachodzicca ŭ haradzkich sawietach i zwyš 90 prac. u wiaskowych. Na 1930 hod stworana 73 nacyjanalnych miastečkawych i sielskich sawietaŭ, złožanych z čužych narodnaściaŭ: žydoŭskich sawietaŭ 25, polskich — 22, rasiejskich — 15, łatyskich — 5, ukrainskich — 3, niamieckich — 2 i litoŭskich — 1.

Kamunistaŭ u Saw. Biełarusi 51 tys. 900, a kamsamolcaŭ 120 tys. (tam kožny chłapiec i dziaŭčyna, kali chočuć dastać słužbu, musiać zapisacca ŭ kamsamoł). Nacyjanalnaha składu partyi „Зьвязда" nie padaje, ale z druhich krynic wiedama, što bolšuju častku kamunistaŭ u Biełarusi stanowiać žydy i rasiejcy, tak, što na kamunistyčnych sabrańniach hutarka wiadziecca parasiejsku, a pratakoł, dla formy, pišacca pabiełarusku. Biełarusy kamunisty bajacca hawaryć pabiełarusku, kab nie ściahnuć na siabie padazreńnia ŭ nacyjanał-demokratyźmie.

Što da školnaj statystyki, to ŭ B S.S R. u wyšejšych nawučalnych ustanowach, pawodle sawieckaj statystyki, wučycca 5 334 studentaŭ. Uwa ŭsich nižejšych škołach, jakich jość 6661 (čatyrochhodak, siamihodak i dziewiacihodak) wučycca 672.574 wučni. Kali hetyja škoły raźbić pa nacyjanalnaj adznacy, to atrymajem: 5.969 biełaruskich škołaŭ, 222 žydoŭskich, 147 polskich, 85 rasiejskich, 18 łatyskich, 11 ukrainskich, 6 litoŭskich, 3 niamieckich, 1 estonskaja i h d.

Jašče raz adznačajem, što nia wiedajem nakolki hetyja ličby sprawiadliwyja, bo ŭsiaki wiedaje, što kožnuju statystyku, asabliwa sawieckuju, prawieryć nia tak lohka.

Piśmo z Arhientyny.

Biełarusaŭ u Arhientynie jość niamała. Adna biada, što sierod biełarusaŭ u Arhientynie niama arhanizacyi, a biez swajej arhanizacyi niama i žyćcia. Taksama i na čužynie, jak i ŭ krai, narod nia majučy swajej arhanizacyi cierpić biadu i prapadaje zaništo. Tyja nacyjanalnaści, jakija majuć swaje mocnyja arhanizacyi, majuć pawahu i pašanu i na čužynie, a niearhanizawanyja ludzi tak i pierakidajucca ŭ hory biaz nijakaj apieki.

Braty Biełarusy! Arhanizujciesia ŭ swaje narodnyja arhanizacyi, bo tolki praz arhanizacyju, i to praz arhanizacyju swaju, možna dabicca lepšaj doli, a biez arhanizacyi my nikoli ničoha nie zdabudziem.

B. Łoś.

Piśmo z Parahwaju.

Naša redakcyja atrymała piśmo ad supracoŭnika „B. Kr.", u jakim apiswajecca žyćcio emihrantaŭ u Parahwaju (Ameryka) woś hetak:

Intelihiencyi emihrawać u Parahwaj nia radžu. U Parahwaj mohuć emihrawać tolki tyja ludzi, jakija mohuć zajmacca ziemlarobstwam. Parahwaj — heta kraina ziemlarobskaja. Pryjechaŭšy siudy emihrant u pieršych hadoch zažywie niamała hora, pakul założyć haspadarku. Ziamla tut uradžajnaja, šmat lasoŭ i zdarowy klimat. Letam, h. zn. ad žniŭnia da traŭnia, praz 8 miesiacaŭ, wielmi horača, a zimoju, h. zn. ad traŭnia da lipnia, ŭdzień łahodnaja temperatura, a ŭnočy bywajuč marozy da 3 hradusaŭ. Wyjaždžajučym u Parahwaj radžu brać z saboju eŭrapejskuju wopratku. Ziamli tut jość udowal i ziamielnyja ŭčastki dajuć na wypłatu. Ale, kab abzawieścisia haspadarčymi pryładami, pabudawać chatu i haspadarskija budynki, a tak-ža nabyć žywiołu, treba mieć kapitał. Toj, chto tut dobra abžywiecca haspadarkaj, žywie dobra.

A. D.

Z Polščy.

Apošnija dni sudu nad „Centralewam" i sojmawaja praca. Dnia 16 h. m. adbyŭsia ŭ Waršawie 39 čarhowy dzień pracesu nad „Centralewam". Dnia 19 h. m. u sali sudu, dzie sudziać b. bieraściejskich wiaźniaŭ, zdaryŭsia pažar, ale ahoń skora abtušyli. Sud hety ŭžo zbližajecca da kanca. Z uwahi na kaladnyja światki, sud budzie spynieny i zakončycca ŭ pieršaj paławinie studzienia 1932 h. Hety wialiki palityčny praces, jaki ŭ historyi Polščy biazumoŭna budzie mieć nadzwyčajna pawažnaje značeńnie, užo dajšoŭ da apošniaj stadyi.

— Dnia 10 h. m., jak my ŭžo padawali ŭ prošłym numary, pačalisia pasiedžańni Sojmu. U Sojmie razwažajuć nad samymi haspadarčymi sprawami. Wialikaha zacikaŭleńnia sojmawaj pracaj presa nie prajaŭlaje. Usie prapazycyi padanyja apazycyjaj, jak zwyčajna, uradawaja bolšaść B.B. adkidaje. Miž inšymi prapazycyjami apazycyi znachodzicca ŭ Sojmie prapazycyja ŭsich polskich apazycyjnych klubaŭ stwaryć śledčuju kamisiju, jakaja-b razhladzieła nadužyćci apošnich wybaraŭ u Pieramyskim wokruzie.

Zakładajcie Hurtki Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury!

З жыцьця Беларускага Народу ў Польшчы.

V. Беларуская Хрысьціянская Дэмакрацыя.

(Працяг, гл. № 40 „Бел. Кр.")

Калі мы пераглядзелі зьбольшага паўстаньне і дзейнасьць БХД, то цяпер падойдзем бліжэй да тых пытаньняў, якія былі закранутыя ў „Дзіле", асабліва-ж да пытаньня адносінаў да сваіх суседзяў (украінцаў і літоўцаў) наагул і да справы Вільні ў асобнасьці.

Аўтар артыкулаў у „Дзіле" галаслоўна, як заўсёды, не падаючы ніякіх дакумэнтаў і крыніц, адкуль ён чарпаў свае весткі, піша, што быццам БХД стаяла на грунце падзелу Беларусі на каталіцкую часьць і праваслаўную з тым, што часьціна з каталіцкаю большасьцю мае будаваць сваё дзяржаўнае жыцьцё супольна з літоўцамі, а так-жа, што „яшчэ ў 1920 г. публічна заяўляла, што да Вільні ня мае ніякіх прэтэнсый ўважае яе сталіцаю Літвы".

Ось-жа на гэтакія закіды мусім зусім аб'ектыўна і бесстаронна сьцьвердзіць, што БХД ніколі не стаяла і цяпер не стаіць на грунце падзелу Беларусі на каталіцкую і праваслаўную часьць, а наадварот заўсёды стаяла на грунце еднасьці беларускага народу на ўсіх яго землях, злучаных у незалежную дэмократычную рэспубліку (гл. пункт 1 Праграмы БХД). У імя еднасьці беларускага народу БХД пашырыла сваю дзейнасьць і на праваслаўных, у імя гэтай еднасьці пачала нават выдаваць свой орган „Б. Крыніцу" ня толькі лацінікай, але і гражданкай, дык трэба дзівіцца, як „Дзіло", не праверыўшы, магло надрукаваць такую хлусьню? Што датыча Вільні, то ані ў 1920 годзе, ані перад, ані потым, у ніякай экуэнцыяцы БХД не заяўляла, што да Вільні ня мае ніякіх прэтэнсій. Сьледзячы за разьвіцьцём палітычнай думкі БХД, а так-жа пільна прагляда̄ючы гадавікі „Б Крыніцы", мы можам сьцьвердзіць, што паводле БХД справу Вільні могуць вырашыць толькі народы беларускі і літоўскі, а найлепшым вырашэньнем гэтага пытаньня БХД ўважае літоўска-беларускую, або нават літоўска-беларуска-ўкраінскую фэдэрацыю. „Калі-б аднак літоўцы — піша „Б. Крыніца" ў № 35.1925 г. — не жадалі ўваходзіць у такую або толькі ў літоўска беларускую фэдэрацыю, у якой яны былі-б меншасьцяй, і калі-б стаялі на грунце граніц з Беларусяй, азначаных расейска-літоўскім трактатам з 12.VII.1920 г. і на грунце ўмовы з урадам Ластоўскага — і калі-б з тых ці іншых прычын лепшай палітычнай літоўска-беларускай граніцы выдумаць ня было-б магчымым, то, на наш пагляд, можна было-б беларусам згадзіцца і на гэта, з тым аднак, што калі беларускі народ стане на ногі сапраўды і калі гэна граніца акажыцца перажыткам і недарэчнасьцяй, то новае паразуменьне беларуска-літоўскае зьменіць гэныя граніцы, ці агулам завядзець новыя ўзаемныя палітычныя адносіны. Аўтаномная частка беларускай тэрыторыі ў пашыранай Літве куды лепш чулася-б і культурна і эканамічна, чым цяпер пад цэнтралістычнай і абшарніцкай Польшчай і хутчэй вяла-б да агульнага адраджэньня і вызваленьня ўсей Беларусі".

Так глядзіць орган БХД на справу Вільні. Перад гэтым, яшчэ ў 1924 г. „Б. Крыніца" (№ 35) у стацьці „Літоўска-польскі спор", так пісала: „Мусім тут адзначыць, што як Літва так і Польшча ў сваім спорах за Віленшчыну не павінны забывацца аб народзе беларускім, які так шыбка адраджаецца, які тут агулам бяручы знаходзіцца ў большасьці і які блізу выключна засяляе ўсходнія паветы Віленшчыны".

Апошнім часам у 1930 годзе, калі ў часе выбарнай кампаніі полёнофільская газэта „Народны Звон" (№ 4), орган Ант. Луцкевіча і Р. Астроўскага, у стацьці „Фальшывыя вэксалі" паставіў закід, што Ярэміч і хадэкі прадалі ўкраінцам усё беларускае Палесьсе, то ў адказ на гэтую хлусьню „Б. Кліч" (№ 4), орган аб'яднаных беларускіх партыяў (БХД, Сельсаюз і Правасл. Аб'едн.), у стацьці „Выдуманыя вэксалі" так пісаў: „У адказ на гэту новую Луцкевічаўскую брахню заяўляем, што ані ў Берасьцейскім, ані ў Пінскім вокрузе сьпіскаў Бел.-Украін. Блёку няма і дзеля гэтага не магло быць ніякай прадажы ўкраінцам усяго беларускага Палесься". Далей у тым-жа „Б. Клічу", у адказ на закіды Луцкевіча, што Ярэміч і хадэкі пацьвярдзілі зробленую Ластоўскім прадажу Віленшчыны Літве, чытаем: „Вось-жа ў імя праўды заяўляем, што мы ніколі і нідзе ніякай прадажы беларускіх земляў не пацьвярджалі, бо на гэта ня маем ніякага права. Не пацьвярджалі мы ніякіх палітычных камбінацыяў Ластоўскага, не пацьвярджалі ўступкі савецкімі ўладамі Віленшчыны і Гарадзеншчыны Літве на падставе Маскоўскага трактату з 1920 году, не пацьвярджалі таксама прадажы ўсей Зах. Беларусі, якую зрабіў „сам" п. Антоні Луцкевіч генэралу Балаховічу. Маладое пакаленьне можа ня помніць дружбы Луцкевіча з Балаховічам, але ёсьць беларускія дзеячы, якія помняць яговыя вэксалі, выданыя гэтаму генэралу".

У канцы „Б. Кліч" так піша: **„Мы заўсёды дзяржаліся і дзержымся таго правіла, што ніхто іншы, а толькі сам Беларускі народ можа пастанаўляць аб сваіх граніцах з суседзямі".**

Z zahranicy.

Konferencyja ab razbrajeńni. U pačatku łutaha 1932 h. maje pačacca ŭ Ženewie suświetnaja konferencyja dziaržaŭ ab razbrajeńni. Da hetaj konferencyi ŭžo pryhataŭlajucca ŭsie bolšyja dziaržawy. Na hetuju konferencyju majuć źjaŭlacca pieradusim pradstaŭniki 56 dziaržaŭ, jakija ŭwachodziać u Lihu Narodaŭ, a tak-ža pradstaŭniki S.S.R.R., Zł. Štataŭ Ameryki, Turcyi i inšych dziaržaŭ, jakija ŭ Lihu Narodaŭ nie ŭwachodziać. U Ženewie dla henaj konferencyi zbudawany specyjalny dom. Na hetu konferencyju ŭ Ženewie čakajuć 5000 učaśnikaŭ.

Demonstracyja biezrabotnych u Paryžy. Ščaśliwuju da hetaha času Francyju, jakaja ŭzbahacieła z suświetnaj wajny, suświetnaja pošaść biezraboćcia taksama nie abminuła. Dnia 16 h.m. pyšny ciapier bahaćciem i jak zaŭsiody wiasiołaściaj Paryž byŭ terenam burliwych demonstracyjaŭ biezrabotnych. Biezrabotnyja ŭ demonstracyjach damahalisia pracy.

Suświetnyja zbažžowyja rynki. Na suświetnych zbažžowych rynkach, u apošnija časy pačałasia wialikaja i niepradbačanaja źnižka cen na zbožža. Ekanamisty pryčyny hetaj raptoŭnaj źnižki cen nijak nia mohuć wytłumačyć. Taksama nia mohuć pradbačyć, jak ułožacca ceny na zbožža na dalej. Pierawažaje pahlad, što ceny buduć padać dalej, asabliwa cana pšanicy. Što da cen na žyta, dyk cana na jaho moža być bolš zroŭnawažana, ale i tut nia wykľučajecca tendencyja źnižki cany. Ahulnyja perspektywy na suświetnych rynkach poŭny niespadziewak.

Wyjšaŭ z druku i pradajecca ŭwa ŭsich biełaruskich kniharniach

Biełaruski adryŭny kalendar na 1932 hod.

Cana 1 złot. Hałoŭny skład Kwašelna 23.

Drukarnia.

Piśmo ŭ Redakcyju.

Wielmi Pawažany Hamadzianin Redaktar!

Hetym wietliwa prosim źmiaścić u Wašaj pawažanaj hazecie nastupnaje:

U suwiazi z tym, što ŭ № 289 „Kurjera Wilenskaha" z dnia 15 śniežnia 1931 h ŭ addziele „Kronika" była źmieščana zaciemka padajučaja niazhodna z praŭdaju prabieh Nadzwyčajnaha Ahulnaha Schodu Biełaruskaha Studenskaha Sajuzu dnia 13.XII.31. Prezydyjum hetaha Schodu i Ŭrad B.S.S. wyjaśniajuć nastupnaje:

Niapraŭdaj źjaŭlajecca, što na Schodzie „chadecko komunizująca" koalicyja starałasia wydalić z Sajuzu tych studentaŭ — siabroŭ Sajuzu, jakija naležać da „K! Scorinia", aie praŭdaj jość, što ŭ Biełaruskim Studenskim Sajuzie, jak arhanizacyi apalityčnaj, nijakich koalicyjaŭ, jak i hrupaŭ palityčna sarhanizawanych, niama. Da B.S.S. majuć prawa naležać usie studenty-biełarusy biaz rožnicy palityčnych pierakonańniaŭ. Sajuz u swajej dziejnaści wioŭ apalityčnuju liniju da hetaha času i budzie wiaści jaje na dalej.

Niapraŭdaj źjaŭlajecca, što Ahulny Schod chacieŭ wydalić z Sajuzu tych siabroŭ, jakija naležać da „K! Scorinia", ale praŭdaj jość, što Ahulny Schod, na padstawie śćwierdžanaj Rewizyjnaj Kamisijaj B.S.S. škodnaj dziejnaści „K! Scorinia" ŭ adnosinach da Sajuzu i na padstawie śpiešnaj prapanowy henaj-ža Rewizyjnaje Kamisii, zabaraniŭ swaim siabrom naležać da „K! Scorinia".

Niapraŭdaj źjaŭlajecca, što Ŭrad B.S.S., zawiešywajučy siabroŭ Sajuzu, naležačych da Prezydyjumu „K! Scorinia", chacieŭ ich prymusić da salidaryzawańnia z presawymi aświedčańniami A.B.S.A., ale praŭdaj jość, što Ŭrad, zawiešywajučy, na prapanowu Rewizyjnaje Kamisii, siabroŭ B.S.S., naležačych da Prezydyjumu „K! Scorinia", nie ŭwachodziačy ŭ źmiest Biuleteniu A.B.S.A., braŭ za padstawu tolki sam fakt wystupleńnia hetych siabroŭ razam z „K! Scorinia", jakaja publična wystupiła suproć A.B.S.A., nia majučy nijakaj na hetaha padstawy, bo „K! Scorinia" da A.B.S.A. nie naležyć. Hety krok „K! Scorinii" adnosna A.B.S.A. možna wytłumačyć tolki błahimi namierami adnosna A.B.S.A., a taksama Biełaruskaha Studenskaha Sajuzu, jaki źjaŭlajecca zwyčajnym siabram A.B.S.A.

Prosim pryniać słowy hłybokaj pašany.

Prezydyjum Ahulnaha Schodu:

Urad Bieł. Stud. Sajuzu:

(—) *St. Stankiewič*
Staršynia

(—) *J. Kłabiš*
za staršyniu

(—) *J. Malecki*
Sekretar

(—) *H. Haŭryličanka*
Sekretar.

P. S. *Zaznačajem*, što hetaje zapiarečańnie było wysłana ŭ redakcyju „Kurjera Wilenskaha dn. 16 XII.31., jakaja adnak da hetaha času jaho nie źmiaściła.

Wilnia, 21.XII 31.

HRAMADZIANIE!

Nie zabywajciesia ab swaich studentach biełarusach!

Składajcie achwiary na „Stypendyjalny Fond"!

Drukujecca i chutka wyjdzie

Biełaruski Kalendar-Knižka na 1932 hod. Kaštue ŭsiaho 50 hrošaŭ.

Kalendar budzie mieć kala sta staronak.

Wypisać možna praz kniharniu „PAHONIA Wilnia, Ludwisarskaja 1.

Prysyłajcie padpisku na „Biełaruskuju Krynicu" i padawajcie ŭ hazetu wiestki ab žycci na wioscy!

Гэтак выглядае справа Вільні, Віленшчыны і наагул адносін да суседзяў паводле БХД і зблёкаваных з ею партыяў.

А цяпер хацелі-б закрануць яшчэ адну справу — гэта закід, які мы спаткалі ў „Ділe" (№ 121), што быццам у часе апошніх выбараў у польскія заканадаўчыя ўстановы (1930 г.) „украінскія партыі, ня знаючы фактычна сапраўднага стану адносін насярод беларусаў, заключылі выбарчы блёк з адной толькі бел. палітычнаю групаю (бел. хрысьціянскія дэмакраты), у поўным праканаваньні, што маюць справу з аб'яднаным беларускім грамадзянствам" — як піша „Діло".

На гэты закід даволі падаць артыкул гэтага-ж самага „Діла" (№ 235 1930 г.) пад заг. „Виборчі гаразди білорусів", дзе пішацца даслоўна так:

„Стварэньне блёку ўсіх украінскіх партыяў было неспадзеўкай для шмат каго з вонкавага сьвету, але яшчэ большаю — і яшчэ прыкрэйшаю — неспадзеўкай было зблёкаваньне ўкраінцаў з беларусамі. Дзеля таго, што немагчымасьць разьбіцьця ўкраінскага блёку была аж надта відавочнай, дык пастаноўлена разьбіць блёк між украінцамі і беларусамі і разлажыць гэтых апошніх. З гэтай мэтай утварыўся так зв. „Цэнтральны Саюз", арганізацыя беларускіх санатараў на чале з Янкам*) Луцкевічам і Ф. Акінчыцам, які зьвярнуўся да Беларускага Нацыянальнага Камітэту з прапазыцыяй адзінага агульна-беларускага фронту. Да Беларускага Нацыянальнага Камітэту, які ўвайшоў у выбарчы блёк з украінскімі палітычнымі партыямі, належаць усе беларускія групы, апроч камунізуючых ды санацыйных. Ось-жа належаць туды: Беларуская Хрысьціянская Дэмакрацыя, Беларускі Сялянскі Саюз і беспартыйная група б. сэнатара Багдановіча. Гэтыя групы паклікалі да жыцьця Агульную Выбарчую Камісію, якая мае правесьці ўсе справы, зьвязаныя з выбарамі.

Прапазыцыяў „Цэнтральнага Саюзу" не адкінулі, але пачалі гутаркі, абманываючы сябе надзеяй, што можа сапраўды згуртаваныя ў „Цэнтрасаюзе" санацыйна настроеныя адзінкі далучацца да блёку і стануць да супольнай працы. Аднак скора вылезла шыла з мяшка. Пасьля двух дзён няяснага крупельства, Цэнтр. Саюз паставіў Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту „ультіматум": да 24 гадзін сарваць блёк з украінскімі партыямі. Ясна, што Б. Нац. Камітэт адказаў адмоўна і дэмаскаваў так зв. Цэнтр. Саюз, як арганізацыю, якая толькі і мела на мэце, каб разьбіць Укр. і Бел. Выбарчы Блёк".

Гэтак пісала „Діло" ў кастрычніку 1930 г. Ня хочацца верыць, каб паважная газэта магла забыцца ў чэрвені 1931 г. аб тым, што пісала ў кастрычніку 1930 году! Дык якая магла быць прычына такой наглай зьмены „курсу"? Няўжо „Діло" ня ведае, што пасол Ярэміч ніколі ня быў хадэкам і ня ёсьць? Няўжо ня ведае, хто такі Антон Луцкевіч і якая яго была роля ў апошніх выбарах? А калі ведала, то нашто пісаць такую пусьцячыну, чытаючы якую беларускае грамадзянства толькі паціскае плячмі, ня могучы згадаць усіх ходаў і выхадаў „Діла"?

А што датыча апошніх выбараў, у каторых вышэй-успомненыя зблёкаваныя партыі ня мелі такой удачы, як у 1928 годзе, то ў гэтым ня іх віна, а правінілася тут нейкая „вышэйшая" сіла, якая хіба-ж добра ведама ўкраінцам з Валыня, якія правялі толькі аднаго пасла! Пры „трохі" лепшых варунках гэтыя самыя беларускія партыі ў 1928 г. правялі 4 паслоў і 2 сэнатараў. Каб і ў 1930 годзе былі прысамсі такія самыя варункі, то рэзультат выбараў быў-бы напэўна гэтакі самы, калі ня лепшы.

Канчаючы агляд беларускага жыцьця пад Польшчай, мы ніколі не асьмеліліся-б сказаць, як сказаў аўтор артыкулаў у „Ділe", што насярод беларусаў ідзе вайна ўсіх проціў усіх. Не, тут у нас ідзе не вайна, а далейшая дыфэрэнцыяцыя ўнутры беларускага грамадзянства, пачатая „Грамадою". Побач з палітычнай і сацыяльнай дыфэрэнцыяцыяй, ідзе яшчэ аздараўленьне грамадзянства праз выкідываньне за борт грамадзкага жыцьця тых гнілых і раскладываючых адзінак, якія, ня маючы самі ніякіх ідэолёгічных асноў, хацелі-б верхаводзіць у беларускім грамадзянстве. Можам сказаць сьмела, што гэтая палітычная і, сказаў-бы, асабістая, дыфэрэнцыяцыя ўжо прыбліжаецца да канца — і мы верым, што беларускі народ разам з сваею інтэлігенцыяй знойдзе для сябе адпаведную дарогу ў саюзе з украінскім і літоўскім народамі.

Канец.

*) Тут „Діло" зрабіла памылку: ня Янкам, а Антонам Луцкевічам, бо Янка Луцкевіч, брат Антона, памёр у 1919 годзе. Антон-жа Луцкевіч цяпер сапраўды стаіць на чале беларускай санацыі.

Wypiswajcie kataloh biełaruskich knih, a z jaho abaznačanyja čyrwonym atramantam

knižki pa tannaj canie!

Biełaruskaja Kniharnia „Pahonia": Wilnia, Ludwisarskaja wul. Nr. 1.

08153

Ab haspadarcy.

Haspadarka ŭzimku.

Z nastańniem zimy ŭvaha ziemlaroba pierachodzić z pola ŭznoŭ pad strachu chlava, humna i samoj chaty. Ale nielha dapuskać, kab navat i ŭzimku tvarylisia na sienažaciach, a tymbolš — na azimych zasievach škodnyja zatopy: ich treba staracca ŭ čas spuskać, kab dabro nie vymakała.

Pakul nia źmierźnie ŭ hrudu ziamla, treba dakončyć pryvodzić u paradak usie asušajučyja ravy na paloch i sienažaciach. Treba tak ža z-usiul paźbirać kamieńni, a sienažaci i paśbišču — nie havoračy ŭžo ab aromym poli — jak najstarańniej pavykarčavać z usiałakich kustoŭ. Ciapier taksama čas, pakul nie nastanie hruda, na naviazieńnie na lohkija piaščanyja hrunty hliny i na napravu daroh (plantoŭka), kab nia psuć na ich pašla kałos i nie maryć koniaŭ. Kab uniknuć vialikaj hrudy na darohach, radziać darohi hetyja prad spadziavanym marozam razbaranavać vostrymi baronami.

Dalšaj spravaj jošć padbać ab akuratny pierahlad letniaj haspadarskaj snaści: što nadapsuta, treba ciapier-ža ŭ volny čas papravić, bo kožnaja reč u paru papraŭlenaja dvojčy vytrymaje. Usie žaleznyja sučastki haspadarskaj snaści treba da sucha vycierci i pašla tolki namazać jakojniebudź kłustaściu, abo zvyčajnaj hazaj (karasinaj) Kali-ž-by heta snašć paśpieło da hetaj pary ŭžo saržavieć, dyk pierš čym namazyvać kłustaściaj, jaje treba vyčyścić z hetaj ržaŭčyny: radziać na heta ŭžyvać miašanki krejdy (abo stearynu) z karasinaj. Hetak abhledžanuju snašć treba pašla tak pamiaścić, kab na jaje ani doždž nie zaciakaŭ, ani śniech nie zaviavaŭ.

Valniejšy čas u zimovyja viečary treba vykarystać na čytańnie razumnych knižak i hazet jak ziemlarobska-fachovych, tak i ahulna-aśvietnych.

U chlavie ŭzimku šmat-šmat čaho jošć paznać i dapoŭnić. Dahlad cielnych karoŭ, jak i samoha cialeńnia, musić być sumlennym. Cielnuju karovu nielha paić ściudzionaj ładovaj vadoj; pa cialeńni karova musić ščyścicca, a ad cialaci nielha adkradać małoziva. — Acialiŭšajasia karova patrabuje buhaja ŭ roŭnych odstupach času, kožnyja try, radziej — čatyry tydni. Znajučy heta haspadar moža volna rehulavać čas cialeńnia karovy, viedajučy, što čas jejnaj cielnaści tryvaje ŭ prybliznaści 285 dzion (41 tydzień).

Cialo na plem radziać puskać najlepš z tych, što naradzilisia ŭ m-cy studzieni.

Pobač z kormam žyvioły, ŭzimku vialikaje značeńnie maje i dahlad: žyvioła štodzień musić pabyvać na volnym pavietry i ŭžyć ruchu. Čystaje i suchoje ŭtrymańnie dla žyvioły naahuł značyć poŭzdaroŭja, a dla śviniej — całaje zdaroŭje. A siahońnia aplacicca trymać i hadavać tolki žyvioŭ zdarovuju.

Vielmi čułyja na maroz byvajuć kury. Pabialeŭšyja ad marozu, abo i prad samym jašče marozam kurynyja hrabiani treba namazać niasolenaj kłustaściaj. Udzień treba davać kuram bulbu z abmieškaj, a ŭviečary — ziarniaty, bo jany praz noč „hrejuć.“ Kab kury hrelisia i ŭ dzień, ich treba zmušać da ruchu: ziarniaty sypulucca ŭ sałomu, kab zmusić kurej kapacca; burak, abo hałoŭka kapusty viešajecca tak vysoka, kab kuryca mahła jaje dastać tolki padskakivajučy; heta sama je značeńnie maje kupańnie kurej u piasku. „Prysmakam,“ pabudžajučym adnačasna kurycu da niasieńnia, jošć źmienia sahretaj kapusty.

Dahladajučy i karmiačy sojskuju ptušku, nielha zabyvacca i ab małych dzikich ptuškach-śpiavakoch, što na zimu astalisia ŭ nas i cierpiać hoład, a ŭletku baroniać ziemlaroba ad napaści roznych škodnych mošak i rabakoŭ.

U zimny dzień, pakul lod čysty jšče ad śniehu, jaho treba piłavać i vazić. Dzie niama ładoŭni, tam na cianistym uzhorystym miejscy sypicca płast torfu, abo siečki, ci ŭreścіe — chvojkavaj skul, na heta ščylna składajecca lod, špary zapaŭniajucca drobnym łodam, abo — padčas marozu — zalivajucca vadoj i ŭsio heta absypajecca ŭznoŭ torfam, miakinaj, abo piłavinami. Utrymańnie biaz stratаŭ łodu praz leta zaležycimie ad taho, jak ščylna byli złožany ładovyja tafli i jak staranna byli jany abtuleny ad dostupu volnaha pavietra.

Dreva na budovu treba piłavać kala Novaha hodu, bo takoje tolki dreva ŭvažajecca za najbolš tryvałkaje. — Sadovyja drevy ŭžo ŭ lutym m-cy treba pabialić vapnaj, bo ŭ praciŭnym razie jany ŭdzień užo nahravajucca ad sonca, a načnyja marazy, pašla dniaŭnoha nahravańnia, mohuć im vielmi paškodzić. Z drevaŭ treba pazdymać usio staroje liście i zamatanyja ŭ pavučynu hniozdy roznych škodnikaŭ nia tolki sadoŭnictva, ale naahuł ziemlarobstva i ŭsio heta staranna spalić.

Čym bližej pad viasnu, tym uvažniej treba hladzieć na polnyja zasievy, kab jany nia dušylisia ani pad źliŭšymsia ŭ ładzianuju skarynku śnieham, ani pad vadoj, z rastaŭšaha śniehu: ładzianuju skarynku treba ŭsiakim sposabam kryšyć, a vadu — spuskać.

inž. A. K.

Da nas pišuć.

PATREBA DOBRYCH RAMIEŚNIKAŬ.

Barok, Staŭpieckaha paw. Kožny narod, kab raźwiwać swaju kulturu, musić mieć intelihiencyju. Pobač z intelihiencyjaj, taksama patrebny i ramieśniki. Intelihiencyja ŭ narodnaj pracy ŭzbahačwaje kraj bahaćciami kultury duchowaj i kiruje hramadzkim raźwićciom kultury materjalnaj, a ramieśniki zadawoliwajuć swajej pracaj patreby štodziennaha žyćcia paasobnych ludziej. Sława taho narodu, jaki maje dobruju, h. zn. zdarowuju duchowa intelihiencyju i dobrych fachowych ramieśnikaŭ, razychodzicca daloka, dy i sam taki narod dobra čujecca. U nas biełarusaŭ, na žal, adnych i druhich pakulšto adčuwajecca niedachop. Kab hadawać swaju i karysnuju dla narodu intelihiencyju, treba mieć swaje adpawiednyja škoły: himnazii, seminaryi, instytuty i uniwersytety. a kab wyhadawać dobrych ramieśnikaŭ, treba mieć ramieślanyja škoły. U nas-ža biełarusaŭ hetaha niama. Naša moładź zdabywaje siaredniuju i wyšejšuju aświetu ŭ čužych pierawažna školach, dyk i ničoha dziŭnaha, što heta moładź, časta wyrakajecca swajho narodu dy jdzie ŭ pasłuhačy da čužyncaŭ. A ramieślanych škoł u nas i susim niama nijakich. U nas na ramieśnikaŭ wučacca najčaściej u partačoŭ i pašla taki ramieśnik-partač partolić praz usio žyćcio, paniżajučy ramieślany fach. Woźmiem za prykład fach krawiecki. U pieršaj lepšaj wioscy, spatkaŭšy niekalki asob, my možam acanić fachowaść kraŭcoŭ tych wakolic. Na žal, my časta spatykajem pryhožuju biełaruskuju dziaŭčynu, abo pryhožaha, dobra zbudawanaha małajca z skryŭlenaj fihuraj partackaj raboty wopratkaj. Hetkich kryŭlakoŭ ramieśnikaŭ u nas chapaje ŭwa ŭsich halinach. Niama tolki dobrych ramieśnikaŭ. Dyk starajmosia wučycca ramiasła dobra i starajmosia, kab u nas byli škoły i ramieślanyja. Jul.

CIAŽKI ČAS.

Mur.-Aśmianka, Aśmianskaha paw. Nastaŭ čas dla sielanina wiejmi ciažki. Zbožža nie ŭradziła, skacina jdzie za biascen, zarabić niama dzie, a padatki naciskajuć. Ab botach dy kramnaj wopratcy niama ŭžo i hutarki. Ušo waročajecca moda łapciej i sukonak. Što budzie dalej, niawiedama, ale da taho, što wioska abułasia u łapci, u łatanyja siarmiahi, u chatach aświačaje łučynaj i biaz soli ješć bulbu, dyk dajšło jakraz.
Framak.

JAK U NAS ADBYŁASIA PIERAPIŚ.

Gierwiaty, Wil.-Trockaha paw. U nas adbyłasia pierapiś woś jak: kamisarami pierapisi byli polskija wučyciali. Pierapiś adbywałasia 9 i 10 XII. s. h. Taki kamisar śpisowy — polski wučyciel, zajšoŭšy ŭ chatu, pytaŭsia: „Za kaho siabie ŭważaješ — lićwina, žyda ci palaka?“ Pačuŭšy adkaz, što za biełarusa, kamisar-wučyciel pačynaŭ dakazwać, što nidzie nijakich biełarusaŭ niama, a mowa, jakuju wy nazywajecie biełaruskaj, kazaŭ taki wučyciel, jošć mowa polskaja, tolki z małoj damieškaj mowy rasiejskaj. Takim sposabam niaświedamych ludziej taki kamisar pierakonywaŭ i zapisywaŭ im „język ojczysty“ polski. Byli i takija wypadki: mowu baćkoŭ zapiswali biełaruskaj, a ichnym dzieciam — polskuju, a heta tamu, što dzieci chodziać u polskuju školu.

Dyk woś jakaja była ŭ nas pierapiś. Musić takaja tam budzie i praŭda ŭ hetaj statystycy.
St.

PAPULARNAJA LEKCYJA.

Kiejpuny, Wil.-Trockaha paw. 22 listapada sioł. h. była ŭ našym Hurtku BIHiK naładžana papularnaja lekcyja. Pračytaŭ henuju lekcyju J. Jarmałkowič. Zacikaŭleńnie biełaruskaj lekcyjaj było wialikaje. Ludzi zyślisia z našaj i susiedniaj wiosak. Paprychodzili słuchać lekcyi i niedruhi biełaruskaha adradžeńnia. Lekcyja ŭsim spadabałasia i pa zakančeńni, prysutnyja dziakawali lektaru. Pažadana, kab takija lekcyi ładzilisia čaściej. B. Šarejka.

MOŁADŹ BIARECCA ZA SWAJO.

Dajnawa, Wil.-Trockaha paw. Naša wioska čysta biełaruskaja. Moładź naša ŭžo biarecca za swajo rodnaje. Na wiečarynach piaje rodnyja biełaruskija pieśni i deklamuje biełaruskija wieršy. Cikawicca naša moładź tak-ža i biełaruskim drukawanym słowam. Čytaje swaje biełaruskija hazety i knižki. Dajnar.

Naša pošta.

Dyrekcyi Nawahradzkaj Biel. himnazii. Abwiestku choć z apaźnieńniem źmiaščajem.

Bułyhu. Wiestki ab zabojstwach atrymali, ale jany ŭžo spoźnieny nie z Wašaj winy, dyk nie padajem.

Jancewiču. Prośbu spoŭnim, ale prysyłajcie padpisnuju płatu. Wy majecie poetyčki styl u pisańni, ale źmiest u Wašaj karespondencyi nia maje ani hramadzkaha, ani narodnaha značeńnia. Pišycie ab žyćci ŭ Wašaj staronсy, budziem drukawać.

Čarwiakowu ŭ Łatwii. Pazdraŭlajem i my Was z światkami Kalad i N. H. Z piśma skarystali, dziakujem.

Špaku. Dziakujem, karystajem. Napišycie, jak u Was adbywałasia pierapiś. Parady wysłany piśmom.

Wyšaŭ z druku zbornik wieršaŭ
A. ZIAZIULI (Ks. Al. Astramowiča)

„Z Rodnaha Zahonu“

Z pradmowaj AD. STANKIEWIČA,

176 bač, — kaštuje 1 zł. 50 hr.

Wypisać možna praz Biełaruskuju Knihárniu „Pahonia“ ŭ Wilni Ludwisarskaja 1.

Dyrekcyja Nawahradzkaj Koedukacyjnaj (dla chłapcŭ i dziaŭčat) Biełaruskaj himnazii

z prawami dziaržaŭnych himnazijaŭ

abwiaščaje pryjmo wučniaŭ uwa ŭsie klasy, za wyniatkam VIII kl., z druhoha paŭhodździa 1931-32 školnaha hodu (ad 1-ha lutaha 1932 h.)

Prośby ab pryjmie, z usimi patrebnymi dakumantami (metryka naradžeńnia, paświedčańnie ab pryšćepie wospy, paświedčańnie ab zdaroŭi i dakumanty ab papiarednaj nawucy) pryjmajucca da 20 studnia 1932 h.

Dyrekcyja.

Redaktar J. Paźniak. Biel. Druk. im. Fr. Skaryny. Wilnia, Zawalnaja Nr. 6—10. Wydawiec A. Šutowič.